УДК 821.161.3 – 1 : 27 – 312.7

# ТЭМА ПАКУТ ПРАЗ ВОБРАЗ ХРЫСТА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Бароўская Ірына Анатольеўна,**
Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (г. Гомель, Беларусь)

*Многія беларускія паэты, задумваючыся над праблемай трагедыйнасці ў лёсе беларусаў, звярталіся да Біблейскіх матываў. Паняцце 'пакуты' выступае ў праваслаўі вельмі важным, калі пачынаецца размова аб выратаванні. Аўтар на прыкладзе твораў Н. Арсенневай звяртаецца да вобраза Хрыста, да паняцця 'пакут' і робіць вывад аб непарыўнай сувязі гісторыі і будучыні*

Трагедыя беларускага народа, яго гісторыі хвалявала і хвалюе прадстаўнікоў літаратуры і культуры. Многія беларускія паэты, задумваючыся над праблемай трагедыйнасці ў лёсе беларусаў, звярталіся да Біблейскіх матываў. Паняцце 'пакуты' выступае ў праваслаўі вельмі важным, калі пачынаецца размова аб выратаванні. Гасподзь наказвае чалавеку праз пакуты пачынаць жыць па Боскіх законах. Гісторыя Сусвету пачалася з грэхападзення Адама і Евы, пасля чаго ў наш свет увайшла варожасць, і пачалася барацьба Дабра і Зла. Тайну Сусветнага Зла раскрывае Біблія, распавядаючы аб ролі сатаны, які бязлітасна не адпускае ўсё чалавецтва, адводзіць людзей ад Бога, ад пакаяння, залівае крывёю і слязьмі усю зямлю. Прафесар І. Штэйнер у артыкуле «Цар бязлітасны", разважаючы над канцэптам 'голад' ў беларускай і сусветнай літаратуры, ахоплены моцным уражаннем, прыводзіць успаміны Н. Арсенневай, якая, адказваючы на пытанне «Чаму ў Вашых творах так многа смутку?», адказала так: «*На гэта мела ўплыў само жыццё ў Вільні. Жылі мы ў вельмі цяжкіх умовах, што і адбілася на маіх вершах. Сястра памерла ў дарозе, пакуль мы ехалі, бацька захварэў, маці таксама была хворая, працы не было. Калі я вучылася ў беларускай гімназіі, дык вельмі часта мы клаліся спаць, не еўшы, ішлі ў гімназію. Усё гэта мела падсвядомы ўплыў на творчасць*» [1, с. 277].

У сваёй творчасці Наталля Арсеннева апісвала вялікае свята Ўваскрасення Хрыстова ў вершах «Уваскрэсьні», «Дай, Добры Кон», «Сьвята Уваскрасеньня», «Ён грець ня сьціхне», «Радасьць», «І была там вясна…», дзе яскрава праступае матыў 'Ўваскрасення-Адраджэння': уваскрасае Хрыстос – уваскрэсне і край беларускі. У аснове – ўсеахопная радасць, якая ў гэты дзень запаўняе прыроду і душу чалавека. Літаральна ў кожным з гэтых твораў сустракаем глыбокую веру ва ўваскрасенне Беларусі, таму што ўваскрос Хрыстос: *…Ускрэсьне Край, бо й Ён ускрос! Мацней за сьмерць, за ўсё, каханьне зямлі, дзе ад дзіцяці ўзрос… Устань-жа, ўстань, ускрэсьні сяньня, мой Край, як уваскрос Хрыстос!* [2, с. 236]

У вершы «Асенняя дарога» сіла жыцця перамагае смерць, сіла духу пераадольвае пагібель: «*Сьвет ёсьць, дык ёсьць чалавек! А пакуль ёсьць чалавек — можна з крыві і руінаў веліч ідэяў снаваць, найпрыгажэйшых за ўсё, можна натхнёна гарэць за чалавецтва… і гінуць, каб на руінах жыцьця зноў красавала жыцьцё!*» [2, с. 86]. Апошнія радкі яскрава перадаюць матыў Уваскрасення Хрыста, які праз пакуты прыняўшы смерць, загінуў за ўсё чалавецтва, даў надзею на перамогу над смерцю. Вясновыя лозы ў свята Вербнай Нядзелі, што пачынае тыдзень вялікіх пакутаў Хрыста, «яны, жывыя, набрынялыя сокамі вясны, падрыхтаваныя, каб паўстаць ахвярай, аддаць сваё цела, як Ісус Хрыстос, каб смерцю сваёй аднавіць надзею на вечнае жыццё [3, с. 248]: *…Даць ахвярнае цела На нясьцерпную сьмерць, пад нажы, Каб у ладанах Вербнай Нядзелі Серабранай вярбою аджыць* [2, с. 248].

Вяршыняй духоўнай паэзіі Наталлі Арсенневай стаўся знакаміты гімн «Магутны Божа!» (у 1947 годзе тэкст быў пакладзены на музыку кампазітарам М. Равенскім),



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дзе ў палымяным, шчырым звароце да Бога людзі аб'ядноўваюцца ў адзіным душэўным парыве ўзносіць малітву за лёс Беларусі, за шчасце, мір і спакой роднай Бацькаўшчыны:

*Дай урадлівасць жытнёвым нівам,*
*Учынкам нашым пашлі ўмалот.*
*Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай*
*Краіну нашу і наш народ* [2, с. 115]

У вобразе безыменнага вандроўніка ў вершы «Ён дайшоў» праступаюць рысы Хрыста – адзінокага, выгнанага з родных мясцін: «*Ён ішоў па росах, па жарсьцве, Ногі ранамі крывавымі зайрдзелі, Вецер стрэчны вочы прыгасіў*» [2, с. 181]. Праз радкі якрава праступае вобраз беларуса, які, як і Хрыстос – блудны сын, вандроўнік, выгнаннік. Чаканы прытулак, родны дом, які ў мроях паўставаў раем, раптам з'явіўся змрочнай карцінай разбурэння.

Паслядоўнае адстойванне хрысціянскіх ідэалаў было характэрна для Наталлі Арсенневай на працягу ўсёй яе творчасці. Тэма адраджэння Беларусі стала амаль галоўнай у творах паэтаў беларускай эміграцыі.

Вяртаючыся да вобраза Хрыста ў беларускай паэзіі, успомнім верш «Ён дайшоў» [2, с. 69] Н. Арсенневай. Тая ж духоўная слепата, якая не знікае з зямлі, што і не дае прыняць і спазнаць з'яўленне Сына Божага. «*Старая, як свет, праўда і непахісныя ў сваёй духоўнай слепаце людзі, якія не ведаюць, што твораць*» [3, с. 65].

«*История для нас – пророк и апостол*» [4, с. 104]. Мы часта спрабуем схавацца ад яе ў сваіх палітычных і жыццёвых справах. А чалавецтву неабходна ўглядацца ў з'явы, якім мы сталі сведкамі ў прамежак свайго часу і збіраць усё, што выступае сутнасцю гістарычнага працэсу. «*В знаках и символах каждого времени открывается Слово, к нам обращенное. Только ради его торжества дается человеку жизнь и человеческая история*» [4, с. 104].

## Літаратура


1. Штэйнер, І. Цар бязлітасны *Канцэпт голаду ў беларускай і сусветнай літарататуры* с. 277 Дзеяслоў: Літ.-маст. часоп. / заснав. – М-ва інфарм. Рэсп. Беларусь. – 2009, жнівень. – Мн. : Медысонт, 2016. – № 2 (81).

2. Арсеньнева, Н. Між берагамі. Выбар паэзіі / Н. Арсеньнева. – Нью-Ёрк ; Таронта : БІНІМ, 1979. – 350 с.

3. Петрушкевіч, А. Наталля Арсеннева : шлях да Беларусі : манаграфія / А. Петрушкевіч. – Мн. : Кнігазбор, 2013. – 179 с.

4. Тайна слова / По благословению Высокопреосвященного ИОАННА, Архиепископа Белгородского и Старооскольского, председателя миссионерского отдела Московской патриархии. – Санкт-Петербург, Москва : «Диоптра», «Лествица», – 2002. – 191 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова